Cana 10 hr. Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 52 (693). Wilnia, Piatnica 25 Śniežnia 1936 h. Hod XII (XX)

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.

HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.

Košty wydawańnia pakrywajuć skladki. Skladka u hod 4 zal., na paŭhoda — 2 zal., na 3 miesiacy — 1 zal.

У Дзень Беларускай Культуры

(Прамова Кс. Ад. Станкевіча на Канцэрце-Акадэміі ў Дзень Беларускай Культуры 13.XII.1936, якую падаём паводле стэнаграмы).

Аб культуры агулам.

Культура... Якое таёмнае і чароўнае слова! Яго поўна ў літаратуры, у ўстановах, у штодзенным жыцьці людзкім, яно на вуснах кожнага сьветлага, думаючага чалавека. У ім скрыта ўсё тое, што так бязупынна і прагавіта здабывае і твора душа чалавека, усё тое, што азначае вартасьць і імкненьні жыцьця людзкога. Навука, літаратура, мастацтва, музыка, рэлігія, а так-жа датасаваньне гэтага ўсяго да жыцьця чалавечага, каб яно было радасным, каб мела сэнс свой і каб было дастойным чалавека — усё гэта разам узятае крыецца пад гэным магічным назовам: культура.

Такім чынам культура, разважаючы яе суб'ектыўна і об'ектыўна, — гэта потэнцыя душы нашай, гэта творчая яе магчымасьць, а так-жа гэта ўсе рэальныя плады гэнай духовай нашай творчасьці. А плады гэтага творства сапраўды вялікія, сьвятыня здабычаў культуры сапраўды чароўная. Ад іскры выкрашанай з каменя аж да іскры электрычнай і да этэрычных фаляў радыёвых, ад сьвечкі ці газьніцы аж да раскошных электрычных лямпіёнаў, ад простай народнай песьні аж да вялікіх паэматаў і аж да сымфоніі музычнай, ад вузкага, тупога й нявольніцкага фэтышызму аж да бязбрэжнага, вольнага і глыбокага монотэізму, ад прымітыўнага ражна дзеравянага аж да скомплікаванага трактара, ад жыцьця стадовага, дзікога і поўнага социяльных супярэчнасьцяў і крыўдаў аж да сучасных грамадзянстваў, абапёртых на вольнасьці і грамадзкай справядлівасьці — вось плады творчай душы людзкой, вось падарожныя шляхі культуры чалавечай.

Культура нацыянальная — частка культуры агульна-людзкай

Творчыя магчымасьці душы чалавека рознаякія, так як рознаякія патрэбы жыцьця яго. Дзеля гэтага і культура бывае не аднолькавая. Гісторыя знае розныя віды культуры залежна ад эпокі, расы, нацыі, клясы, ад адзінак, якія яе твораць, ад таго ўрэшце асяродзьдзя, у якім грамадзянства якое ці адзінка прабывае. Гісторыя знае культуры рэлігійныя, у якіх галоўным матывам і характарам творства чалавека ёсьць рэлігія, знае так-жа гісторыя культуру капіталістычную, буржуазную, якая мае характар пэўнай выключнасьці, недаступнасьці для шырокіх масаў, якая мае характар свайго роду клясавасьці.

Сяньня культура перажывае крызыс, сяньня культура шукае сабе новых шляхоў, новых дарог. Дарогі-ж гэтыя ўжо можна заўважыць, яны ўжо відацца, яны йдуць у кірунку прадусім двух праблемаў, двух вартасьцяў — у кірунку праблемы нацыянальнай і адначасна соцыяльнай. Вызваленьне прыгнечаных нацыяў і соцыяльных клясаў — гэта галоўныя мэты сучаснага грамадзянства, а дзеля таго ў гэткім кірунку адбываецца і культурнае творства сяньнешняга чалавека.

Знача, старыя культуры ўміраюць, — новыя родзяцца. Так, але гэта вымагае некалькі слоў агаворкі. Старыя культуры ўміраюць, але не цалком — умірае ў іх тое, што было патрэбай часу, што было „signum temporis", а вартасьці агульна-людзкія і вечныя, якія ёсьць у кожнай культуры, астаюцца назаўсёды. Вось-жа і новая ўсякая культура, якая нараджаецца, яна з аднаго боку карыстаецца з культуры старой, а з другога боку — прыносіць новыя, сучасныя вартасьці, якімі ўзбагачвае скарб агульна-людзкой культуры. І сяньнешняя культура, якая творыцца пад знакам нацыі і соцыяльнай праблемы — іменна зьяўляецца гэнай новай вартасьцяй для ўсяго чалавецтва.

Дасягненьні беларускай культуры.

У пагоні за культурным творствам, паслушны свайму прыроднаму творчаму інстынкту, беларускі народ так-жа тварыў і творыць сяньня сваю культуру, займаючы пачэснае месца сярод іншых культурных народаў. Даўней, на зары свайго існаваньня, беларускі народ, дзякуючы свайму географічнаму палажэньню, апынуўся сярод двух вялікіх культур — візантыйскай і лацінскай. Сьпярша быў ён пад уплывам выключна культуры візантыйскай, пазьней-жа далучыліся, хоць у значна меншай меры як першай, і ўплывы культуры лацінскай. Дзякуючы гэтаму, беларускі народ карыстаўся з гэных вялікіх культур і адначасна тварыў сваю ўласную, якая была сынтэзай гэных вялікіх і старых культур, заўсёды аднак з перавагай культуры візантыйскай.

Найбольшы развой і расцьвет старой беларускай культуры прыпадае ў гісторыі на XVI стагодзьдзе. У літаратуры, навуцы, у развою жывой народнай мовы, а так-жа ў жыцьці палітычна-грамадзкім у гэтым часе спатыкаем, як на той час, даволі вялікія дасягненьні беларускай культуры. Галоўнай характэрнай рыскай гэнай беларускай культуры была яе выключнасьць, яе клясовасьць, баярскасьць. Культуру тады тварылі так званыя вышэйшыя клясы, якія ўрэшце пакінулі і сваю гэную культуру і свой народ, адыходзячы да чужынцаў, і аддаючы ім свае сілы матар'яльныя і духовыя. Беларуская, такім чынам, старая культура, з адыходам сваіх тварцоў, не дайшоўшы да шырокіх народных беларускіх масаў, замёрла і скасьцянела.

Але народ астаўся верны сваей нацыянальнай стыхіі і сваю нацыянальнасьць хаваў далей, да лепшага часу, у сваім народным творстве: у песьні, прыказцы, пагаворцы, у байцы, у сваей мове агулам. І гэны лепшы час урэшце надышоў. У пачатку XIX ст. засьвітала над сьветам зара романтызму, зара, пад якой пачаліся тварыцца новыя нацыянальна-соцыяльныя сучасныя культуры. Павеў вясны романтызму дайшоў і да Беларусі і так-жа ажывіў сонны беларускі народ. Дзейнасьць тут гэтага романтызму была аднак сьпярша дужа нязначная, ледзь прыкметная, аж урэшце праявілася ў форме беларускага рэнэсансу, у форме сучаснага беларускага адраджэньня.

Рэнэсанс гэты фактычна пачаўся нядаўна, бо найбольш гадоў 45 таму. Рэнэсанс гэты належа лічыць ад часу выхаду ў сьвет «Беларускай Дудкі» Багушэвіча з яе слаўнай прадмовай, у якой знаходзіцца ведамы кліч: «не пакідайце-ж мовы нашай беларускай, каб ня ўмёрлі». Рэнэсанс, такім чынам, беларускі адбываецца сапраўды нядаўна, але для беларускай новай сучаснай культуры зрабіў сапраўды шмат. Сяньня ўжо ўва ўсіх галінах жыцьця беларусы працуюць на ніве роднай культуры і часта цалком паважныя пакідаюць вынікі гэтай працы. Ужо беларусы сяньня могуць пахваліцца здабычамі ў навуцы, у мастацкай літаратуры, у музыцы, у мастацтве агулам. Праўда, у некаторых галінах культурнага творства мы яшчэ толькі ў пачатку, у некаторых яшчэ дарабіліся нямнога, але затое ў некаторых асягнулі пункты роўныя з народамі старых культураў. Гэткімі культурнымі асягненьнямі можам мы пахваліцца ў паэзіі. Нашы вялікія песьняры Янка Купала, Якуб Колас і інш. сьмела могуць раўняцца з вялікімі клясыкамі эўропэйскіх народаў. Сілу і ўзоры для свайго культурнага творства беларусы чэрпаюць з народных крыніц, як-бы спаўняючы Багушэвічаў загад — «Не пакідайце-ж мовы нашай беларускай, каб ня ўмёрлі» і за гэта як-бы дар нясучы свайму народу, шырокім яго масам, усе вялікія дабрадзействы культуры.

Значэньне Дня Беларускай Культуры.

Словам, і беларускі творчы дух мае ўжо свае культурныя здабычы, мае ўжо чым пахваліцца, мае з чым паказацца ў людзі. «Дзень Беларускай Культуры» такім чынам гэта сапраўды сьвята беларускага творчага духа, гэта дзень сынтэзы беларускай культуры.

Значэньне гэткага дня, гэткага сьвята аграмаднае. Прадусім з пункту гледжаньня практычнага. Культура, звычайна, складаецца з працы розных асоб, розных установаў, з розных культурных арганізацыяў, каторыя папрацавалі пэўныя пэрыёды часу, а каторых юбілей адзначыць паасобку дзеля іх многасьці няма магчымасьці. Ацэньваць іх і сьвяткаваць трэба разам, супольна. І так напрыклад сёлета ў нас мінулі 15-я ўгодкі ТБШ, 10-я БІГіК, 15-я Беларускага Музэю ім. Івана Луцкевіча, 20-я сьмерці паэткі і дзеячкі-адраджэнкі Цёткі, 10-я сьмерці паэта Казімера Сваяка, хутка ўрэшце наступяць 15-я ўгодкі пісьменьніка народніка Антона Лявіцкага (Ядвігін Ш). Каронай-жа гэтых усіх сёлетніх беларускіх юбілеяў зьяўляецца 30-лецьце літаратурнага творства нашага вялікага народнага паэта Якуба Коласа. Вось-жа дзень беларускай культуры, які сяньня сьвяткуем, мае сваей мэтай адзначыць ня толькі здабычы беларускай культуры агулам, але так-жа і гэтыя ўсе ўспомненыя сёлетнія юбілеі, якія такім ці іншым спосабам так выдатна да ўзросту і да пашырэньня гэтай культуры прычыніліся.

З беларускіх народных крыніц, у вялікай меры з народнай песьні, творыцца сучасная беларуская культура. Вось-жа й ня дзіва, што й гэты «Дзень Беларускай Культуры» сьвяткуем тэй-жа народнай песьняй.

24036

Za palepšańnie bytu biełaruskaha sialanstwa

U prošłym numary „Bieł. Krynicy" my pisali ab patrebie ŭ našym krai šyrokaj ziamielnaj reformy. Ciapier zwaročwajem uwahu na patrebu sprawiadliwaj apłaty sialanskaj pracy.

Biełaruskaje sialanstwa — heta najbolšaja častka biełaruskaha narodu, jakaja ciapier najbolš prycisnuta žyćciowymi ciažarami. Našaje sialanstwa ŭ bolšaści małaziamielnaje i biezziamielnaje, jakoje patrabuje pabočnych stałych zarabotkaŭ. Dziela taho, što hetych zarabotkaŭ nia ŭsim chapaje, paŭstaje ŭ našych siołach biezraboćcie. Małaziamielnyja sialanie z tytułu ŭłaśnictwa choć małych i nie samawystarčalnych haspadarak majuć padatkawyja abkłady, a mnohija nawat i pazyčkowyja daŭhi. Hetyja haspadarčyja ciažary małaziamielnyja sialanie mohuć apłačywać tolki z pabočnych zarabotkaŭ, bo małaziamielnaja haspadarka patrebnaha na pakryćcio hetych raschodaŭ dachodu dać nia moža. Kali-ž niama pabočnych zarabotkaŭ— małaziamielnyja sialanie adstajuć z apłataj padatkaŭ i nia mohuć spłačywać pazyčkowych daŭhoŭ. Pryhetym h. zw. „nažnicy" cenaŭ miž cenami na pramysłowyja tawary i ziemlarobskija pradukty abnižajuć žyćciowyja patreby małaziamielnaha sialanstwa.

Usie hetyja pryčyny trymajuć biełaruskaje sialanstwa ŭ biadzie, jak u žaleznych klaščoch,

Dziela hetaha, jak my ŭžo nia raz pisali, biezadkładna patrebnaja ŭ našym krai šyrokaja ziamielnaja reforma, pry jakoj byli-b nadzielenyja da poŭnaziamiella małaziamielnyja i biezziamielnyja sialanie, a tak ža normalizacyja ŭ cenach — miž cenami wyrabaŭ pramysłowych i cenami ziemlarobskaj pradukcyi. Wyraźniej — sialanstwu patrebnaja normalizacyja cenaŭ, kab była apłačana sprawiadliwa jahonaja praca, ułožanaja ŭ hadoŭlu skaciny i pradukcyju ziamielnych pładoŭ.

Ahułam kažučy ŭ žyćci sialanstwa patrebnyja hruntoŭnyja reformy: patrebnaja ziamielnaja reforma, patrebnaja ekanamična-haspadarčaja arhanizacyja (kooperacyja ŭsialakich widaŭ) i adnačasna haspadarčaja aświeta ŭwa ŭsich halinach hetaha zaintarasawańnia.

Tolki hetkim šlacham možna papravić byt sialanstwa i na hety šlach biełaruskaje sialanstwa my škiroŭwajem. *p.*

Сьвяткаваньне дня культуры мае так-жа вялікае значэньне і з пункту гледжаньня агульнага, прынцыповага. Гэткае сьвята дае магчымасьць углыбіцца ў тайніцы культуры агулам, лепш пазнаць яе чарадзейскія вартасьці і запаліцца да далейшай творчай, культурнай працы

Сьвяткаваньне дня культуры мае ўрэшце значэньне аб'яднаўчае і зблiжаючае адзін народ з другім. Нішто так ня зблiжае народаў між сабой, як узаемнае пазнаньне культурных цэннасьцяў кожнага з іх. А патрэба збліжэньня гэтага асабліва адчуваецца між народамі нашага краю, якія належна пазнаўшы ўзаемна свае культурныя здабычы, узброіўшыся ў аружжа культуры духа, супольна павінны ісьці да супольных культурных мэтаў

Сяньнешні Дзень Беларускай Культуры спадзяёмся будзе пачаткам сьвяткаваньня падобных дзён кожнага году. А мэта гэткіх сьвяткаваньняў у тым, каб здабываючы тайніцы прыроды агулам і тайніцы душы чалавека, штораз сьвятлей асьвячаць жыцьцёвыя сьцежкі, штораз больш здабываць жыцьцёвай праўды, справядлівасьці грамадзкай, радасьці жыцьця і бязупынна імкнуцца, як сказаў паэт, — да сонца і да зор...

Дзень Беларускай Культуры

Сёлета беларускае грамадзянства адзначыла многія юбілеі беларускіх культурна-асьветных установаў, юбілеі тварцоў беларускай культуры і юбілеі яе пашырэньня беларускімі арганізацыямі наладжаньнем урачыстай акадэміі-канцэрту Дня Беларускай Культуры.

Дзень Беларускай Культуры быў наладжаны ў нядзелю 13 сьнежня 1936 году.

Урачыстая акадэмія адбылася 13.XII.1936 г. у Вільні, у вялікай і прыгожай залі літоўскай гімназіі імяні Вітаўта Вялікага пры вуліцы Домброўскага 5.

Пачалася яна а гадзіне 18 —6 увечары. За прэзыдыяльным сталом пад знакам Пагоні засеў Камітэт гэтай урачыстасьці ў такім складзе: Кс. Ад. Станкевіч — ведамы беларускі дзеяч і культурны працаўнік, С. Паўловіч — культурна-асьветны працаўнік, Р. Шырма — папулярызатар беларускай песьні, беларускія паэты М. Машара і М. Танк, рэдактар інж. Ад. Клімовіч, П. Сергіевіч — ведамы беларускі мастак, рэдактар Я. Пазьняк, рэдактар мгр. Я. Шутовіч і прадстаўнік студэнцтва М. Канцэлярчык.

Вялікая заля была запоўненая народам — больш 600 асоб; сярод прысутных былі прадстаўнікі Украінскай Парлямантарнай Рэпрэзэнтацыі: пасол Троян і пасол Волянський, прадстаўнікі літоўскага грамадзянства: дырэктар Шыкшніс, кс. Беляўскі, кс. Віскант і рэдактар Р. Мацкевіч; адвакат Крест'янов — расеец; адвакат Крыжаноўскі; рэдактар Л. Абрамовіч і др. Г. Дэмбінскі — палякі; сьвяшч. протоерэй Грамадзкі, сьвяшч. а. Мацэвіч і інш.

Акадэмію адчыніў кароткімі словамі рэдактар інж. Ад. Клімовіч, перадаючы ўступное слова Кс. Ад. Станкевічу. Гэтае ўступное слова, запісаўшы з прамовы, друкуем на першым месцы — замест перадавіцы.

Уступным словам Кс. Станкевіча першая частка акадэміі, згодна з праграмай, на якую адміністрацыйныя ўлады выдалі дазвол, была закончана. Пачалася другая частка акадэміі — прывітаньні.

Першы вітаў Беларусаў з нагоды ўрачыстасьці Дня Беларускай Культуры ад імя Украінцаў прадстаўнік Украінскай Парлямантарнай Рэпрэзэнтацыі пасол Троян, выражаючы нязьменнасьць добрых суадносінаў між Украінцамі і Беларусамі, а так-жа адзначаючы вартасьць беларускай культуры для Украінцаў і агульна-людзкай справы. Прыгэтым пасол Троян падчыркнуў, што культурнае ўзбагачэньне Беларускага народу мае вялізарнае значэньне і для справы народу Украінскага, бо гэтыя два братнія народы злучаныя гістарычна і сучаснасьцяй супольным лёсам і іх аднолькавыя шляхі да лепшай будучыні.

Прадстаўнік літоўскага грамадзянства дырэктар Шыкшніс, вітаючы Беларусаў у сьвята Дня Беларускай Культуры адзначыў факт супольнасьці культуры, беларусаў і літоўцаў у мінуўшчыне — г. зв. культуры шляхоцкай, баярскай і паклікаючыся на літаратурную творчасьць Я. Купалы і Я. Коласа, выразіў пажаданьне Беларускаму народу разьвіцьця беларускай культуры ў сучаснасьці, чэрпаючы яе так жа і з скарбніцы агульна-людзкай.

У канцы гэтай другой часткі акадэміі інж. А. Клімовіч падаў прывітаньні тэлеграфічныя і пісьменныя ад беларускага студэнцтва заграніцай і беларускіх дзеячоў у Краі — з правінцыі.

Канцэрт.

Трэцяй часткай акадэміі Дня Беларускай Культуры быў высокай вартасьці мастацка выкананы, багатай музыкальнай кампазыцыі — А. Грэчанінава, К. Галкоўскага, А. Сьвешнікава, М. Анцэва, М. Чуркіна і М. Аладава — канцэрт беларускай песьні.

Гэты канцэрт выкананы: солё ведамым, вялікай славы сьпеваком тэнорам Міланскай і Пазнанскай опэры Міхалам Забэйдай-Суміцкім з акомпаніямантам на фортэпіяне ведамага кампазытара праф. К. Галкоўскага і хорам пад умелым кіраўніцтвам шырока ведамага рэгента Р. Шырмы.

Канцэрт пачаўся сільным і мастацкім выкананьнем хору кантаты на словы М Танка, музыкальнай апрацоўкі К. Галкоўскага. Далей вялікі хор пад умелым кіраўніцтвам грам. Шырмы памастацку прапяяў вязанку беларускіх н. песьняў — „А мне труднeнька", „Зялёны гай", „А ў полі вярба", „Па саду хаджу", „Кукавала зязюлька", а так-жа песьню „Вясна" М. Васілька ў музыкальнай апрацоўцы К. Галкоўскага.

На гэтым першая частка канцэрту была закончана; за мастацкі сьпеў і мастацкае яго выкананьне вялізарная, больш паўтысячная грамада слухачоў, абдарала хор і яго кіраўніка вялікай бурай воплескаў; рэгент Р. Шырма абдараваны за гэты мастацкі сьпеў вялікім букетам жывых красак.

Другая частка канцэрту была з песьняў хорам іншага характару. Наўперад прасьпявана „Усе разам" Я. Купалы ў музыкальнай апрацоўцы М. Анцэва і далей „Ой гыля, гыля гусі вадою" — народная песьня ў гарманізацыі А. Грэчанінава. У канцы другой часткі канцэрту хор паказаў ува ўсей красе беларускую народную сюіту—„Каханьне" часьць I, гарманізацыі К. Галкоўскага.

Слухачы адчулі красу беларускай песьні, доказам чаго былі энтузыястычныя бурныя воплескі і просьбы болей гэтай духовай стравы

На сцэне Міхал Забэйда - Суміцкі.

Трэцяя частка канцэрту была нязвычайная — Міхал Забэйда-Суміцкі, сярод сваіх землякоў першы раз, паказаў чароўную красу беларускай песьні. Беларуская песьня з вуснаў Забэйды-Суміцкага выплывала ў нязвычайнай красе — гэта была ня песьня, а чар, нэктар — жыцьця на збалелыя беларускія нэрвы.

Міхал Забэйда Суміцкі пры фортэпіянным акомпаньямэнце праф. К. Галкоўскага мілагучна прапяяў гэткія беларускія народныя песьні ў апрацоўцы музычнай А. Грэчанінава — „Лeціць сарока", „Конь бяжыць", „Шчука рыба ў моры", „Ой, рана куры запелі і песьні Я. Купалы і Ясакара ў музычнай кампазыцыі М. Чуркіна і К. Галкоўскага.

Трэба адзначыць, што сьпеў Міхала Забэйды-Суміцкага слухачоў проста ачараваў—воплескі слухачоў зьліваліся з славамі „брава" і „біс" у адзін доўга нясьціхаючы гул вялікае масы людзей; на сцэну пад ногі сьпевака кідалі краскі; на сцэну маладыя дзяўчаты прынесьлі два пукі ў кошыках жывых красак для Забэйды-Суміцкага і К. Галкоўскага. Забэйду-Суміцкага беларуская моладзь парвала на рукі і насіла на руках па залі. Словам, энтузыязму проста ня было спыну.

У канцы трэба адначыць, што сьпеў Забэйды-Суміцкага, а так-жа і хор пад кіраўніцтвам Р. Шырмы ўскалыхнулі чуцьцё слухачоў не памалу. А даканалі яны гэтага ўмелым, мастацкім выкананьнем беларускай песьні, чар якой, што выплывае з душы Беларускага народу, ускалыхнуў чуцьцё прысутных.

Агулам кажучы аб акадэміі і канцэрце Дня Беларускай Культуры трэба адзначыць, што гэная ўрачыстасьць мае вялізарнае значэньне ў нашым цяжкім, заморанным і шэрым штодзенным жыцьці. Мае гэная ўрачыстасьць вялікае значэньне для нашай моладзі, якая гэтак чынна прыймала ўчасьце ў ладжаньні гэтай акадэміі, мае ня меншае значэньне і для старэйшага грамадзянства, заціснутага цяжарамі жыцьця і штодзеннай працай. Урэшце мае найбольшае значэньне для агульнай беларускай справы.

Дзень Беларускай Культуры — гэта выяўленьне агульнай цэласьці культурных вартасьцяў Беларускага народу. р.

Міхал Забэйда-Суміцкі

(З прычыны выступленьня на Акадэміі ў чэсьць Дня Бел. Культуры).

Жыцьцёвая дарога М. Забэйды - Суміцкага.

М. Забэйда радзіўся ў 1900 г., у беззямельнай сялянскай сям'і ў в. Шэйпякі, Косаўскага пав. (Палесьсе), дзе і да сягоньня жыве маці артыста. Ваенная хваля 1915 г. выкінула М. Забэйду на ўсход: Пенза, Смаленск, Барнаул (Тамбоўшчына) і ўрэшце далёкі Харбін. За гэты час М. Забэйда абсольваваў вучыцельскую сэмінарыю,



Міхал Забэйда-Суміцкі

вучыцельскі інстытут, а ў Харбіне — эканамічны аддзел праўнага факультэту мясцовага унівэрсытэту, працуючы пры гэтым як настаўнік у розных школах, апошнім часам у сярэдняй гандлёвай школе („коммерческое училище") ў Харбіне.

Адначасна з працай на штодзенны кусок хлеба, М. Забэйда ад самых дзіцячых гадоў мрыяў аб сьпеве. Грунтоўна аднак пачаў займацца сьпевам—і наагул музыкай—толькі ў Харбіне, пад кіраўніцтвам партнэркі Шаляпіна Юліі Плотніцкай, Мэттэра і Томашынскай. На гэту ж пару прыпадаюць і першыя выступленьні артыста ў Харбінскай опэры ў першых ролях „Евгенія Онѣгина", „Русалки", „Снѣгурочки" і інш. Аб тагочасных выступленьнях М. Забэйды вострая крытыка ў адзін голас прарочыла вялікую будучыню артыста. Напр. пасьля пастаноўкі „Евг. Онѣгина" харбінская „Заря" (№ 300, 1929 г.) пісала: „Ему (М. Забэйдзе) отлично удалась сцена на балу у Лариных, но в сценѣ дуэли он превзошел ожиданія". Іншая газэта (кітайская „Гунбао") піша ў тым жа часе што „чуткій музыкальный пѣвец, Забейда старается осмыслить роль в мельчайших деталях и по возможности перевоплотиться при исполненіи роли Артист со временем навѣрное будет пожинать лавры на этом завидном поприще".

На гэту аднагалосную хвальбу артыст аднак здаваўся быць глухім і ў 1932 г. ён пакідае Харбін і выяжджае ў Італію, у Мілан, каб там далей працаваць над сваім голасам пад кіраўніцтвам слаўнага праф. Фэрнандо Карпі. І тут, як перш у Харбіне, М. Забэйда, дзякуючы сваім здольнасьцям і пільнасьці, хутка выбіваецца наверх і яго ангажуюць ў слаўную Міланскую опэру „La Scala". Перадавыя італьянскія крытыкі ў афіцыяльным органе Акадэміі новачаснай музыкі „Giornale del arte" раўняюць М. Забэйду з бясьсмертным італьянскім Т. Скіпай ды з ведамым расейскім сьпеваком Собінавым. Падобна адазваліся аб М. Забэйдзе і іншыя італьянскія крытыкі, трафна зазначаючы, што артыст сьпявае ня толькі голасам, але і душой. Напр. „Corriere di Savona" пісала: „Тэнар Міхал Забэйда-Суміцкі і гэтым разам пацьвердзіў здабычы з апошніх сваіх артыстычных падарожжаў. М. Забэйда-Суміцкі здраджвае ўражлівую душу мрыючага паэта, гэтак характэрыстычную для славянаў. Ягоны голас робіць уражаньне да-

сканальнага інструманту, які здабывае і чаруе слухачоў".

Па трыгадовым з лішком пабыце ў Італіі, артыст-сьпявак у 1935 г. вярнуўся ўрэшце на Бацькаўшчыну, якой ня бачыў роўна 20 гадоў. Родныя палеткі чаравалі артыста, але клопатам канец яшчэ ня прыйшоў. Пасьля некалькіх надзвычай удачных выступленьняў у родным Косаве і іншых родных мясцох, артыст прыняў запросіны ў опэру ў Пазнань, дзе і прабыў праз цэлы сэзон. Апошнія тры месяцы з лішнім М. Забэйда жыве ў Варшаве, удачна канцэртуючы як г. зв. сьпявак эстрадовы, а так-жа выступаючы ў радыё. З радыёвых выступленьняў пазналі М. Забэйду і віленскія беларусы, якія і запрасілі яго на аднаразовае выступленьне на Акадэміі ў чэсьць Дня Беларускай Культуры.

Аб гэтым выступленьні М. Забэйды трэба затрымацца крыху даўжэй.

М. Забэйда сярод беларусаў 13.XII.36.

Выступленьне ведамага сьпевака М. Забэйды-Суміцкага на Акадэміі ў чэсьць Дня Беларускай Культуры дня 13 г. м. ў Вільні само ў сабе было нязвычайным сьвятам.

Саліст Міланскай (у Італіі) і Пазнанскай опэры М. Забэйда належа да ліку тых чарадзеяў вокальнага мастацтва, якія умеюць заваражыць слухача ад першага тону. Пасьля першага солёвага нумару-песьні („Ляціць сарока" — народная) уся заля ўздрыгнула ад бурных воплескаў. Гэты ўзьняты настрой нарастаў да нябачанага дагэтуль на беларускіх імпрэзах энтузіязму і закончыўся тым, што беларускія студэнты на руках вынесьлі артыста із сцэны, і высака падкідваючы, абнесьлі па залі. Такі ўздыйм нашай моладзі зусім зразумелы. Беларуская солёвая песьня ў поўным бляску сваей нязвычайнай красы, маккай і далікатнай настраёвасьці, у Вільні першы раз выйшла на сцэну разам з артыстам М. Забэйдай, які паказаў сябе тонкім мастаком у перадачы ўсіх адценяў, як народнае мэлёдыйнае песьні, так і свабоднай музычнай творчасьці на словы нашых паэтаў.

Чатыры папулярна - апрацаваныя А. Грэчанінавым народныя беларускія песьні: „Ляціць сарока", „Конь бяжыць", „Шчука — рыба ў моры", „Ой, рана куры запелі" — у выкананьні М. Забэйды і пры мастацкім акомпаньямэнце праф. К. Галкоўскага давалі суцэльны і закончаны абраз тонкіх перажываньняў маладой беларускай душы як у хвіліны жыцьцёвай радасьці („Ляціць сарока") і бурлівых імкненьняў („Конь бяжыць"), так і вялікага гора-суму, калі льюцца дробненькія сьлёзы (Шчука — рыба ў моры") і ўрачыстага сьвяточнага настрою („Ой, рана куры запелі"). Толькі праўдзівы артыст-мастак мог так цудоўна перадаць народную песьню.

У дальшых нумарох свабоднай творчасьці былі дадзены да канца прадуманыя музычныя абразы і паказана багатая вокальная тэхніка артыста, а што самае галоўнае на наш пагляд, то гэта да канца захаванае мастацкае пачуцьцё меры: у кожнай песьні была поўная гармонія паміж кампазытарам, паэтам і праз артыста-выканальніка — з публікай, якая ад першага мамэнту і да самага канца ўсёй душой і вачыма была зьвязана з артыстам.

Першым нумарам пасьля песьняў народных ішла песьня М. Чуркіна: „Ты прыйдзі!" на словы Я. Купалы; другім — музычны абразок Аладава: „Лета", таксама Я. Купалы. Трэцім быў раманс К. Галкоўскага: „Ці грэх цябе любіць?" на словы Ясакара. Артыст паўтараў гэты нумар, бо публіка, асабліва маладая, ня выпускала артыста са сцэны. Пасьля апошняй песьні К Галкоўскага „Абнімі ты мяне, маладая", на словы Я. Купалы, дзе было асабліва многа пачуцьця і агню, артыст быў змушаны сьпяваць панад праграму, бо публіка ня выходзіла, а дамагалася на біс усё дальшых і дальшых песьняў.

Без найменшай перацяжкі можна сказаць, што слухачы і ўдзельнікі Акадэміі ў чэсьць Дня Беларускай Культуры, дзякуючы рэдкастатным сьпявацкім здольнасьцям М. Забэйды, першы раз пачулі беларускую песьню солё ўва ўсей яе красе. Песьні нашай чэсьць, а Паважанаму сьпеваку шчырая падзяка, разам з пажаданьнем, каб Ён і далей культ для нашай песьні пашыраў усюды, куды закіне яго цяжкае жыцьцё артыста.

Ш. К.

З БЕЛАРУСКАГА ЖЫЦЬЦЯ

Суд. 12.XII. Віленскі Гарадзкі Суд засудзіў б. рэд. „Бел. Крыніцы" Я. Пазьняка на арышт і 200 зл. штрафу за артыкул, зьмешчаны ў „Бел. Крыніцы."

Беларускія народныя калядкі па радыё. У нядзелю 3-га студня 1937 году Беларускі Хор Р. Шырмы выступіць з беларускімі калядкамі ў Польскім Радыё. Перадача з Вільні на ўсе радыё-станцыі ў Польшчы распачнецца а гадзіне 14-й і 50 мінут.

У праграме: 1. „А ў гаспадара," гарм. Т. Уладзімірскага, 2. „Ішла каляда," А. Грэчанінава, 3. „Саўка ды Грышка," К. Галкоўскага, 4. „Ці дома сам пан гаспадар," Л. Рагоўскага, 5. „Ой куры ня пейце рана," А. Грэчанінава, 6. »Неба і зямля," 7. „Шчодры вечар," 8. „Ой рана куры запелі," 9. „На ярдані ціхая вада стаяла", К. Галкоўскага.

„Калосьсе." Кніжка 5 (9) беларускага літаратурна - навуковага квартальнага часапісу „Калосьсе" выйшла ўжо з друку. Кніжка гэта прысьвячана Народнаму Баяну Якубу Коласу, з нагоды 30-й гадаўшчыны Ягонай літаратурнай дзейнасьці. Зьмест багаты і цікавы. Цана кніжкі 50 гр. Складка на „Калосьсе" на год 2 зл. На асобную кніжку—50 гр.

Адрас рэд. і адм. „Калосься"— Вільня, Завальная 1—2.

Wiečar ukrainskaj pieśni ŭ Waršawie

U niadzielu, dnia 6.XII sioleta ŭ Waršawie, u zali W.T.W.„Ukrainskaja Studenckaja Hramada" ładziła kancert p. n. „Wiečir strileckoj pišni". Wialikaja, pryhoža ŭdekarawanaja zala, źmiaściła ŭ sabie bolš 300 asob.

Miašany chor (pierawažna studenty) pad kiraŭnictwam I. Tkačuka (student) wielmi dobra wykanaŭ swajo zadańnie. Kancert pačaŭsia „Zaklikam" Niedilskoho. Referat pračytaŭ redaktar B. Kraŭciŭ. Z wialikim abznajamleńniem i mimikaj deklamawała adryŭki z paezii Łepkaha N. Popowičanka.

Z mužčyn solowuju partyju wioŭ O. Stecura z dobraj znajomaściaj i technikaj muzyki.

Žanočkuju partyju wiała Ž. Čarniaŭskaja, — świedamaja biełaruska, katoraja aprača hetaha wykanała solo „Čoŭnik chitajetsia" Ludkiewiča i na bis „Saławiejku". Wopleskam nia było kanca. I nia dziwa: hołas śpiawački pryhožy, technika adpawiednaja, interpretacyja wysoka kulturnaja, hłybokaja, ščyra adčuta, ścisła harmanizujučaja z adtworanaj kampazycyjaj. Zwaračwaje wialikuju ŭwahu dykcyja piaśniarki. Čarniaŭskaja ahułam wykanała swajo zadańnie wielmi dobra, možna spadziawacca, što Čarniaŭskaja budzie wialikaj śpiawačkaj našaje Baćkaŭščyny.

Maładoj biełaruskaj artyscy žadajem pamysnaje pracyŭ halinie wokalnaha mastactwa, da čaho jana maje wialiki i niaštodzienny talent.

Kancert zakončany ukrainskim himnam, katory ŭsie prysutnyja na zali ŭstaŭšy prapajali.

Piotr Łastaŭka.

Usim supracoŭnikam, čytačom i prychilnikam „Bieł. Krynicy" z nahody KALADNYCH ŚWIAT najlepšaje pažadańnie składaje

Redakcyja „Biełaruskaj Krynicy".

U litoŭcaŭ

10-lećcie Litoŭskaha Sajuzu Wučycialoŭ. Świancianskaha addziełu, litoŭcy wučyciali adświatkawali 6 XII. sioleta. Za dziesiać hadoŭ swajho isnawańnia Sajuz hety šmat pałažyŭ pracy na niwie litoŭskaj narodnaj aświety. Miž inšym warta adznačyć, što biblijateka Świancianskaha addziełu maje 2.061 knihu, jakaja wydatna słuža sprawie litoŭskaj kultury.

Wiečar litoŭskaj presy niadaŭna naładziŭ Litoŭski Studencki Sajuz u Wilni. Miž inšym na hetym wiečary byli dwa referaty, jakija ŭsiestaronna padčorkwali značeńnie presy ŭ litoŭskim hramadzkim žyćci.

Adozwa studentaŭ. Studenty litoŭcy pamiaŝcili ŭ litoŭskich hazetach adozwu ŭ sprawie pašyreńnia litoŭskaj presy pad nazowam: „Čytajma i aświačajmasia".

„Zajzdruje litoŭskaj Wanelii". Pad hetkim charakternym nazowam u Nr. 99a „Viln. Ryt." u addziele karespandencyjaŭ spatykajem nastupnuju zaciemku z Kamajaŭ: „Naša parafija miašanaja: žywuć u joj litoŭcy, biełarusy i niekalki panoŭ. Jašče prad 30 hadami ŭ kaściele nia tolki čytałasia Wanelija i było litoŭskaje kazańnie, ale tak-ža časta bywali i litoŭskija śpiewy. Paśla astałasia tolki Wanelija palitoŭsku i dwa razy ŭ hod litoŭskija kazańni. Hetki paradak trywaje i siańnia. Apošnim časam akazałasia niekalki nia našaj parafii ludziej, jakija zažadali skasawańnia litoŭskaj Wanelii. Pieršy da hetaha dadumaŭsia wojt Makarewič. Choć jon sam pierawažna ŭ kaściele nia bywaje, ale choča źmianić paradak nabaženstwa. Dziela hetaha 28.XII ŭručyŭ sołtysam adpawiedny list papiery i zahadaŭ, kab źbirali podpisy, jakija buduć pasłany arcybiskupu, kab skasawać čytańnie palitoŭsku Wanelii. Treba adznačyć, što z biełarusaŭ mała chto padpisaŭsia, a litoŭcy swaim paradkam pačali źbirać podpisy, kab Wanelija była palitoŭsku čytana i dalej."

Ad siabie musim dadać, što razumna robiać biełarusy, što nie prykładajuć swajej ruki da litoŭskaj kryŭdy. Bolš taho — biełarusy pawinny staracca padtrymać litoŭcaŭ, a takža damahacca i dla siabie biełaruskaj mowy ŭ dadatkowych nabaženstwach u kaściele.

Kanfiskata Nr 98 „Viln. Ryt." byŭ skanfiskawany za art.: „Pa 17-cioch hadoch" i „Paraŭnańnie."

Jašče kanfiskata. Nr. 99 „Viln. Ryt." skanfiskawany za niekalki artykułaŭ.

Z frontu hišpanskaj wajny

Apošnimi časami hišpanskim fašystym užo nie ŭdajecca raźbiwać respublikancaŭ. Madryd, jaki fašysty spadziawalisia zabrać za 2—3 dni, akazaŭsia hrobam dla ich. Respublikancy za stalicu borucca z fašystymi na žyćcio i śmierć, a dziela taho, što ŭ narodzie sympatyi pa staranie respublikancaŭ, fašysty ŭ hetaj baračbie słabiejuć, a respublikancy macniejuć.

Prajekt wyrašeńnia sporu mirnym sposabam.

Anhlija z Francyjaj źwiarnulisia da najbolš zacikaŭlenych dziaržaŭ— Niamieččyny, Italii, Partuhalii i SSSR z prapazycyjaj, kab hetyja dziaržawy sapraŭdy nia ŭmiešywalisia ŭ hišpanskija nutranyja sprawy i ŭsie razam źwiarnulisia da hišpanskaha ŭradu i paŭstancaŭ z prapazycyjaj spynieńnia chatniaj wajny i wyrašeńnia sporu sposabam ahulnaha hałasawańnia pad mižnarodnaj acharonaj.

Pryhetym treba adznačyć, što amerykanskija dziaržawy užo wydali specyjalnuju adozwu da Hišpanii, kab spyniła bratabojčuju wajnu i wyrašyła swaje spory mirnym sposabam — hałasawańniem.

Što-ž na heta hišpanskija fašysty? Fašysckija hienerały zajawili, što jany na nijakaje narodnaje hałasawańnie nia zhodziacca.

Z hetaha jasna, što fašysty bajacca narodnych masaŭ i zhary wiedajuć, što narod za ich hałasawać nia budzie, dyk dziela hetaha nia chočać narodnaha hałasawańnia i spynieńnia bratabojčaj wajny. Z hetaha jasna tak-ža, što paŭstańnie fašystaŭ u Hišpanii — heta fašysckaja wajna z narodam.

Wialiki pierawarot u kitajskaj armii

U minułym tydni ŭ kitajskaj armii staŭsia wialiki pierawarot. Kitajskaje wojska ŭ prawincyi Sijan-Fu zbuntawałasia procił nankinskaha ŭradu i kamandziera maršała Čan-Kaj-Šeka.

Maršał Čan-Kaj-Šek — heta wialiki patryjot Kitaju, umieły palityk kitajskaj niezaležnaści i sprytny dyplomat.

Čan-Kaj-Šek, dobra znajučy sučasnaje pałažeńnie Kitaju i wiedajučy zachopnickija imknieńni Japonii, dasiul mocna stajaŭ na stanowišču niezaležnickaj palityki Kitaju, nie paddajučysia prawakacyi japoncaŭ i nie apirajučysia na siłu Sawietaŭ procił Japonii.

Ciapier zbuntawanaje wojska, na čale z maršałam Čanh-Sue Lianham wystupiła procił wiernych addziełaŭ Čan-Kaj-Šeka i apošniaha aryštawała.

Zbuntawanaje wojska, wyraźniej marš. Čanh-Sue-Lanh, damahajecca ad nankinskaha ŭradu abjaŭleńnia wajny z Japonijaj za Mandžuryju. Nankinski ŭrad wysłaŭ wojska procił zbuntawanaha Čanh-Sue-Lianha i abwieściŭ jaho zdradnikam. U bitwie miž kitajskim wojskam šmat zabitych i ranienych. Paśla bitwy pačalisia pierahawory.

Niama sumlewu, što hety bunt maje hłybokija kareńni zahranicaj Kitaju. Pryjacieli Japonii ćwierdziać, što wajskowy bunt kitajcaŭ maje suwiaź z Sawietami, a z inšaha boku kažuć, što heta japonskaja prawakacyja, kab japonskaje wojska mieła pryčynu zajmać dalej kitajskija ziemli i zawodzić tam swaje paradki.

Ahułam kažučy — Kitaj ciapier apanawany čužyncami, jakija nia čurajucca tam najahidniejšaj prawakacyi, dyk nie wykłučajecca prawakacyja i ciapier. Ale z jakoha boku jana pachodzić—pakulšto razabracca trudna.

Dalejšaje ŭniezaležnieńnie Irlandyi

Irlandyja, jakaja jašče niadaŭna była pad uładaj Anhlii, wyzwaliŭšysia i stwaryŭšy swoj samastojny byt, dalej uniezaležniwajecca ad anhielskaj „apieki".

Z pryčyny źmieny ŭ Anhlii karala Irlandzki sojm pryniaŭ pastanowu, jakaja źmianiaje kanstytucyju Irlandyi.

U hetaj pastanowie skazana, što kasujucca tyja parahrafy kanstytucyi, u jakich było wyražanaje prawa dla anhielskaha karala i jaho zastupnika hieneralnaha hubernatara Irlandyi.

Pryhetym irlandzki sojm adznačaje, što anhielski karol maje prawa hołasu ŭ irlandzkich sprawach tolki sa zhodaj na heta rady ministraŭ Irlandyi.

Hazety ŭ hetaj sprawie pišuć, što paśla hetkich pastanowaŭ Irlandyja astaniecca adnak nadalej pry Anhlii, ale tolki anhielskaj daminijaj, padobnaj da Kanady.

Z Sojmu i Senatu

Ad 15 h. m. adbywajucca plenarnyja pasiedžańni Sojmu i Senatu.

U Senacie adbyłasia dyskusija nad pramowaj premjera hien. Sławoj-Składkoŭskaha, skazanaj na pieršym plenarnym pasiedžańni Sojmu. Adbyłasia dyskusija nad pramowami pradstaŭnikaŭ uradu tak-ža i ŭ Senacie.

Sojm, uznawiŭšy plenarnyja pasiedžańni, paśla prawiadzieńnia wybaraŭ piataha wice-maršałka Sojmu, na miesca ŭstupiŭšaha pasła Byrki — wybrana pasła Kielaka, — prystupiŭ da razhladu prajektaŭ nowych zakonaŭ.

Za skasawańnie ŭtrakwistyčnych škoł.

Na apošnim plenarnym pasiedžańni Sojmu pasoł D. Wełykanowyč padaŭ prajekt źmieny h. zw. jazykowaha zakonu i skasawańnia ŭtrakwizmu ŭ narodnych školach.

Na padstawie hetaha-ž zakonu sioleta i raniej bielaruskija sialanie padawali školnym uładam deklaracyi z damahańniem nawučańnia ichnich dziaciej pabiełarusku.

Jak hety zakon wyhladaje ŭ praktycy — bielaruskija sialanie dobra wiedajuć.

Roznyja wiestki

Pamior Wasyl Stefanyk. 7.XII. siol. pamior wiedamy ukrainski piawiec ab doli pracoŭnaha Ukrainskaha narodu, b. pasoł Ukr. Soc.-Radykalnaj Partyi Wasyl Stefanyk.

Adstaŭka Horadzienskaha jepiskapa Antonija. Prawasłaŭny jepiskap u Horadni Antonij padajecca ŭ adstaŭku, a na jaho miesca prychodzić jepiskap Sawa.

Z HAZET.

„Niadola biełarusaŭ." Pad hetkim zahałoŭkam „Ukr. Wisty" za waršaŭskaj „Gazetaj Polskaj" (Nr. 342) padaje wiestku ab žyćci biełaruskich wučniaŭ u internacie pry Wil. Biel. himnazii i adznačaje, što heta „skandał," kab na 120 asob dawali zupu zwaranuju na 10 kil. kaściej i 1 kil. miasa.

Praŭda, heta warunki žyćcia prosta nia ludzkija. Ale niachaj budzie wiedama redaktarom „Gazety Polskaj," što biełaruskija studenty jašče ŭ horšych warunkach wučacca i što amal usie biełaruskija sialanie tak-ža nia lepšyja majuć warunki žyćcia.

Rasiejskija hazety. U Wilni wychodziać 2 štodziennyja rasiejskija hazety — „Russkoje Słowo" i „Nowaja Iskra." Polskija hazety padajuć, što paŭstała i treciaja štodziennaja hazeta „Naš Wiestnik", pieršy numar katoraj administracyjnyja ŭłady skanfiskawali.

Z hetaha bačym, što rasiejskaja presa ŭ našym Krai dawoli pawažnaja, jakaja kolportujecca i pa našych biełaruskich siołach. A kali-ž biełarusy zdabuducca na štodzienńuju hazetu?

Z POLŠČY

Z haspadarčaj palityki. Wicepremjer Kwiatkoŭski ŭ Sojmie zajawiŭ, što ŭrad nia budzie abnižać cany polskaha złotaha. Urad atrymaŭ u Francyi pazyčku 2 miljardy 800 miljonaŭ frankaŭ. Hetaja pazyčka atrymana na ŭzmacnieńnie polskaj waluty i na roznyja haspadarčyja sprawy.

Polska-rumynskija suadnosiny. U minułym tydni haściŭ u Polščy rumynski ministar Antoniesku. Meta haściny min. Antoniesku — wyjaśnić supolnuju liniju polska-rumynskaj zahraničnaj palityki.

Polska-rumynskaja zahraničnaja palityka takaja — Polšč nie zrakajecca dobrych suadnosinaŭ z Madziarščynaj, z jakoj Rumynija nia ładzie, a Rumynija nie pakidaje Čechasławaččyny, katoraja maje spor z Polščaj.

Dyk miž Polščaj i Rumynijaj adnosiny astajucca i dalej nia zimnyja i nia ciopłyja.

U Berezu Kartuskuju. Hetymi dniami z Krakaŭskaha wajawodztwa ŭłady wysłali ŭ łahiery adasabnieńnia ŭ Berezu Kartuskuju 12 asob zapadozranych u kamuniźmie.

— Nadowiačy delehacyja siemjaŭ „izalawanych" u Berezie Kartuskaj pradstawiła wice-maršałku Senatu i wice-maršałku Sojmu warunki žyćcia „izalawanych" u Berezie Kartuskaj.

Sprawa Prytyckaha ŭ Najwyšejšym Sudzie. Zasudžany ŭ dźwioch sudowych instancyjach S. Prytycki na karu śmierci, za aružny napad u Wilenskim Akr. Sudzie na świedku Strelčuka i tajnaha palicejskaha, padawaŭ u Najwyšejšy Sud kasacyju. Najwyšejšy Sud prysud śmierci skasawaŭ i pieradaŭ sprawu na nowy razhlad u Apelacyjny Sud.

Z ZAHRANICY

Sawiety stajać za kirylicu. Jašče za žyćcia Lenina ŭ Sawietach chacieli źmianić kirylicu na łacinicu. Niekatoryja narody SSSR užo zawodzili łacinskija litary. Ciapier užo waročajucca ad łaciniki da kirylicy i ŭsiudy starajucca pisać i drukawać kirylicaj.

Balšawiki ab chryščeńni Rusi. Wiedamy balšawicki paet Dziemjan Biedny ŭ swoj čas napisaŭ libretto dla opery „Bahatyry", u jakoj wyśmiejwaŭ chryščeńnie Rusi. Ciapier specyjalnaja kamisija ŭ Maskwie zhaniła hetuju operu i zabaraniła jaje bolš stawić u teatry. Swaju pastanowu hetaja kamisija matywuje tym, što opera Dz. Biednaha „Bahatyry" pradstaŭlaje chryščeńnie Rusi niehistaryčna i ŭ naśmiešliwym widzie; a praŭdaj jošć, što chryščeńnie Rusi heta świetłaja bačyna ŭ historyi rasiejskaha narodu, bo jano pamahło zbližeńniu sławianskich narodaŭ z kulturnymi narodami.

Daśledčyki św. Piśma pad nadzwyčajnym sudom u Niamieččynie. Nadowiačy nadzwyčajny (darazny) sud u Dortmundzie sudziŭ 30 asob za prynaležnaść da relihijnaj sekty „Daśledčyki św. Piśma", abwinawačanych za heta ŭ prociŭdziaržaŭnaj dziejnaści. Prakuror dakazwaŭ, što „Daśledčyki św. Piśma" heta worahi dziaržawy. Sud zasudziŭ 6 asob pa 3 hady astrohu.

„Pawiesić kardynała" — „niachaj žywie Hitler". Niadaŭna ŭ Miunchenie adbywałasia ŭračystaść 50-cilećcia parafii św. Kryža. Na hetuju ŭračystaść pryjaždžaŭ niamiecki kardynał Faulhaber i ŭ kaściele adpraŭlaŭ uračystuju Imšu. Kali paśla Imšy kardynał wyjšaŭ z kaścioła, wychawanaja ŭ hitleraŭskim duchu moładź napała na kardynała i kryčała — „pawiesić kardynała — niachaj žywie Hitler". Treba adznačyć, što hitleraŭskich „hierojaŭ" i palicyja nie razhaniała.

Vypisvajcie i čytajcie!

„Šlach Moładzi"

«Шлях Моладзі»

ilustravany časapis biełaruskaje moładzi. Drukujecca hraždankaj i łacinkaj. Vychodzić akuratna raz na miesiac užo ad 1929 hodu. Źmiaščaje ŭ formie dla ŭsich dastupnaj, artykuły z haliny samaŭzhadavańnia, historyi, litaratury, krajeznaŭstva. pryrodaznaŭstva, hramadzkaha žyćcia, mnoha vieršaŭ i inšych litaraturnych tvoraŭ i padaje šmat roznych cikaŭnych viestak, jak z biełaruskaha žyćcia. tak i z žyćcia ŭsiaho śvietu. „Šlach Moładzi" jošć najlepšym pryjacielem i razryŭkaj dla biełaruskaj moładzi. Padpiska na hod kaštuje 2 zł., na paŭhoda — 1 zł., cana numaru 20 hr. Adrys redakcyi: Vilnia, Zavalnaja 1—2. (Wilno, Zawalna 1—2).

Дамагайцеся ўсюды календара кніжкі, на якой напісана выразна:

„Беларускі Сялянскі Календар"

так, як гэта відаць на побач замешчанай адбітцы. Карысьць із тага календара відаць з далучанага зьместу:

Зьмест.

бач.

I. 1937.

Календорыюм . . . . 3—33
Важнейшыя юбілеі і ўгодкі ў 1937 г. . . . . . . 34—35

II. Беларусы . . . 36—43

III. Сельская гаспадарка.

Агульны агляд гаспадаркі . . . . 44—49
Дагляд над земляробскімі прыладамі і снасьцяй . 49—50
Увагі аб гнаёх . . . . 50—52
Абэцэда штучных гнаёў . . . . 52—53
Аб удабрэньні расьцін штучнымі гнаямі . . . . 53—54
Некалькі слоў аб садох . . . . , ... 54—56
Асновы гародніцтва . . . . 56—61
Практычныя зацемкі аб жывёлагадоўлі . . . . 61—63
Асновы кармленьня жывёлы . . . . 63—65
Для ведама пчаляроў . . . . 65—66

IV. Лекарская помач.

Галоўныя асновы здароўя . . . . 67—68
Кароста . . . . 68—69
Лекарская помач . . . . 69—72

V. Парады.

Розныя парады для земляробаў . . . . 73—78
Розныя парады для рамесьнікаў . . . . 79—83
Парады гаспадаром у беларускай мастацкай літаратуры . . . . 83—95
Праўныя парады . . . . 96—103

VI. Інфармацыйны аддзел.

Меры і вагі . . . . 104—105
Беларускае арганізаванае жыцьцё . . . . 106—107

Цана календара 50 грашоў.

Галоўны склад—Беларуская Квігарня «ПАГОНЯ» Вільня, Завальная вул. № 1—2.

БЕЛАРУСКІ СЯЛЯНСКІ КАЛЕНДАР НА 1937 ГОД

Redaktar A. Dasiukiewič — Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 2. — Wydawiec A. Šutowič